# Відэа-кейс "Радавод"



Аўтар: Ірына Семяненка, музычны кіраўнік
дзяржаўнай установы адукацыі “Дзіцячы сад №1 г.Ельска”

# ВІДЭА-КЕЙС “РАДАВОД”

Відэа-дапаможнік
для ўстаноў дашкольнай адукацыі

Відэа-дапаможнік накіраваны на далучэнне да беларускай мовы і нацыянальнай культуры.

Адрасуецца педагагічным работнікам устаноў дашкольнай адукацыі, бацькам.





**Мэта:** адраджэнне нацыянальнай самасвядомасці, развіццё асобы выхаванца, захаванне і ўмацаванне духоўна-маральных каштоўнасцяў, ідэй пераемнасці пакаленняў і гістарычнай памяці.

**Задачы:**

- ствараць умовы для інтэлектуальнага, маральнага і эмацыйнага самавыяўлення асобы дзіцяці дашкольнага ўзросту;
- фарміраваць ўяўленні аб сямейных традыцыях і каштоўнасцях;
- развіваць беларускае маўленне і культуру маўленчых зносін дзяцей; уменне расказваць пра сямейныя традыцыі складна, паслядоўна, выкарыстоўваючы складаныя сказы;
- дапамагчы ўсвядоміць адказнасць за захаванне праваслаўных традыцый, праз якія перадаюцца маральныя і духоўныя каштоўнасці і звычаі, створаныя продкамі;
- выхоўваць паважлівае і беражлівыя адносіны да свайго мінулага, гісторыі і культуры свайго народа;
- выхоўваць свядомую асобу дзіцяці, якая паважае гісторыю і традыцыі свайго народа.

Дзіця 1 - Гэты куфэрак, старынны, чароўны,
Нездарма радаводам  назвалі, дарэчы.
Ен дарагіх успамінаў поўны
І незвычайных сямейных рэчаў.
З хваляваннем сення яго адчынілі,
Каб вам расказаць, чым жа так даражылі
Нашы бабулі, нашы дзядулі,
Потым – татачкі і матулі.
І мы будзем іх цяпер зберагаць,
Каб потым дзецям сваім перадаць
Памяць пра продкаў і пра наш род.
Вось чаму куфэрак – наш радавод!



Дзіця 2 - Гэта рэч – не проста **збан**.
Гэта збан-ветэран.
Ведаю: у  сорак шостым
Дзед яго прывез з Берліна.
І таму для ўсей сям'і
Не просты ен камочак гліны.
І, хоць збан дасюль прыдатны,
Мы з яго вады не п'ем.
Гэты падарунак знатны
З той пары і беражэм.
Ен – пра дзеда ўспамін.
Пра тое, як ен браў Берлін.



Дзіця 3 - **Шторы** – праца прабабулі
І яе руплівых рук.
Усміхніся мне бабуля:
Пра цябе гаворыць унук.

Педагог  - Шмат гадоў жыве ў хаце
Гэты **вобраз Божай маці**.
Яшчэ бабуля з ім размаўляла,
І дапамогі ў бядзе чакала.
Калі мне цяжка, ці крыўдна бывае,
Здаецца, і мне ен дапамагае.
Усміхнецца мне Божая маці,
І становіцца сонечна ў хаце.
Відаць, бабуля, за нас прасіла,
І благадаці для нас маліла.



Педагог - **Хустка** ад бабулі – такая таямніца:
Старэнькая, здаецца, а не магу я надзівіцца.
Гляджу – і бачу бабулю,
Сялянскую прыгажуню.
Сама любіла прыбірацца,
Таму няма чаго здзіўляцца,
Што хустачкі яна купляла
І ў куфар роўненька складала.
Адна хусцінка – на спатканне,
На вяселле – ужо другая,
Гэту – дзеткам падарыць!
Глядзі ж, прыгожая якая!
Гэта хусцінка – у храм насіць,
Гатай - унучку адарыць.
З той пары хусцінку гэту
Берагу, як успамін.
Дзякуй, бабуля, табе за гэта.
Помніць буду свае карані!



Дзіця 4 - Утульна было ў бабчынай хатцы
Ў будні. І весела было ў святцы.
І што толькі не стаяла
На гэтым **абрус**е!
Калдуны, мачанка, квас,
Калядныя гусі!
Верашчака, бульба, сала…
Розных страў было нямала!
Цяпер ціхенька ляжыць
Ў шафе на паліцы
Не лянуецца з усімі
Успамінамі дзяліцца.
Пра бабулін, пра абрус
Мне матуля расказала,
Слухаць мне было цікава!
Вось і вам распавядала.



Дзіця 5 - Гэта што за цуд такі? –
Мы ў матулі запыталі.
Тоўсты, рукі ў бакі …
Што ен робіць тут, у зале?
- Гэта, дзеткі, **самавар**, -
Нам матуля адказала.
І пра цуд бліскучы гэты
Вось што нам распавядала.
Гэта – памяць аб бабулі,
Аб яе матулі, тату,
Што збіралісь за сталом
З **самавар**а піць гарбату.
Аб’ядновае усіх
І цяпер пузаты цуд.
П’ю гарбату, усміхаюць:
Цябе, бабуля, помніць буду!



Дзіця 6 - Абразок такі маленькі,
Але для ўсей сям’і бясцэнны,
Ад прадзеда ен мне дастаўся.
На покуці стаіць нязменна.
І няхай ен вельмі просты,
Няма тут бісеру, шаўкоў,
Без камянеў і пазалоты,
Ен праз усю вайну прайшоў.
Дзед жывы з вайны звярнуўся.
Колькі ен прайшоў дарог!
І сказаў, што гэты вобраз
Яму вельмі дапамог.
Цяпер нам дапамагае,
Ад бяды аберагае.



Дзіця 7 - Гэты гадзіннік мы бачым з дзяцінства.
Колькі гадзін за жыцце налічыў!
І да таго, як да нас ен трапіў,
У прапрабабулінай хаце жыў.
Праўнуку ад прабабулі дастаўся.
Няхай жа адлічвае далей гадзіны!
Мы разумеем: ен не проста гадзіннік!
Ен – захоўвальнік успамінаў.



Дзіця 8 - Захоўваем, як спадчыну,
Вазу для цукерак.
І, калі кладзем цукеркі
У паперках, без паперак,
Прапрабабулю ўспамінаем,
Хоць не бачылі ні разу.
Пра яе жыцце-быцце
Нам раскажа гэта ваза:
Любіла прысмакі і пільна сачыла,
Каб не было ў вазе пуста,
Што была яна гасціннай
Жанчынай з вытанчаным густам.



Дзіця 9 - Мала я ведаю пра медалі.
Прапрадзядулю не бачыў ні разу.
Але, што ен быў чалавекам годным,
Я зразумеў самастойна, адразу.
Бо медалі не даюць проста так:
Іх трэба працай сваей заслужыць
Альбо за подзвіг даецца медаль.
Смелым і  мужным патрэбна быць.
Таму медалі беражэ ўся сям’я.
Помніць буду дзядулю і я!



Дзіця 10 - Гэта пярсценак прабабуля насіла,
Матулі на памяць яго падарыла.
Матуля мне яго передала,
Каб я цяпер яго берагла.
Я пярценак  гэты  ў скрынку палажыла.
Ведай, прабабуля: цябе я не забыла!



Дзіця 11 - Вось рушнік дарагі,
Вышываны берагі,
Накідка вышыта таксама.
Паказала мне іх мама.
Цяпер ведаю і я,
Як жыла мая сям’я:
Прабауля ўмела ткаць
І прыгожа вышываць.
Бабуля з матуляй яе паважалі
І памяць аб ей для мяне захавалі.



Дзіця 12 - Гэты вобраз ад прадзядулі
Мне ў спадчыну застаўся.
Што яго я не забуду
Прядзядуля спадзяваўся.
Ну, вядома ж, не забуду
І заўседы помніць буду,
На вобраз дзедавы дзівіцца
Раніцай і ўвечары маліцца.



Педагог - Гэта не проста аб нечым карціны:
Аб роднай сям'і маей успаміны,
Аб тым, як жылося матулі і дзе,
У тых незапамятных дзен чарадзе.
Восем дзетак нарадзіла бабуля,
І ўсім было ў **гэтай хатцы** ўтульна.
З родных куткоў, з далекіх дарог
Усе імкнуліся на аганек.
Вышывала маці рупліва, старанна
На Ражство падарунак для сваей мамы.
Цяпер і  я помню веску Трайчаны,
Адкуль мая матуля родам,
І мне дарагі аганек у ваконцы,
Хоць столькі год праняслось карагодам!
Праца матуліна будзе жыць
І памяць про род наш доўга храніць.



Педагог - А гэты **сшатык** – самы дарагі!
З ім я ніколі не растаюся:
З боллю і радасцю ў рукі бяру,
Раніцай і ўвечары, калі малюся.
Не было друкаваных малітвасловаў
І маці для нас, для траіх дачок,
Ад рукі малітвы перапісала:
Кожную літару, кожны кручок.
Гэта – цяпло матуліных рук,
Гэта – шчодрасць яе душы,
Гэта – святло яе добрых вачэй.
Цяжка успаміны варушыць…





Педагог - Гэта твор – гісторыя кахання -
**Вышыты** мамай таксама старанна.
Гэта – успаміны аб першай сустрэчы,
Аб тым, чым жылі, чым займаліся,  дарэчы.
У танцавальным гуртку, дзе сустрэлісь,
Бацькоў  адразу паставілі разам.
Так, у пары, пайшлі па жыцці,
Пакахаўшы адзін аднаго адразу.

Дзіця 13 - На жаль, у нас не засталося
Ад продкаў рэчаў, толькі ўспаміны
Аб тым, як дружна ўсе жылі,
Спраўлялі разам імяніны,
На Паску кулічы пяклі,
І яйкі  разам фарбавалі,
А на Ражство  рабілі зорку
І весела  калядавалі,
Песні звонкія спявалі
І Хрыста ўспаміналі.
І вырашыла так матуля:
Ад нас традыцыя пачнецца!
І **вобраз**, створаны ад сэрца,
Хай з рода ў род перадаецца.





